**КАМУНІКАТЫЎНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СКАЗА** – прадуманы парадак размяшчэння кампанентаў сказа, які ўлічвае яго актуальнае чляненне.

Існуе шэраг сінтаксічных падыходаў, якія з розных бакоў асвятляюць арганізацыю сказа:

- **лагічны** – аналізуе сказ як адзінку, што выражае думку, якая мае звычайна двухкампанентную структуру: лагічны суб'ект і лагічны прэдыкат;
- **структурны** – адлюстроўвае сістэму сінтаксічных сувязяў у сказе;
- **функцыянальны** – улічвае кампаненты сказа з боку іх функцыянальнай прызначанасці;
- **семантычны** – вызначае агульнатыпавую семантыку сказа і яе арганізацыю;
- **камунікатыўны** – даследуе актуальнае чляненне.

Цэласнае ўяўленне пры сказ як сінтаксічную адзінку можна атрымаць толькі пры пэўным аб'яднанні рознааспектных характарыстык. Асноўным падыходам пры вывучэнні сказа на сучасным этапе з'яўляецца структурна-семантычны аспект з улікам камунікатыўнага характару думкі.

**Сінтаксічнае чляненне** – падзел кампанентаў сказа на члены (галоўныя і даданыя) з выяўленнем іх асноўнай семантыкі і сінтаксічных сувязяў.

Сказ як мінімальная адзінка звязнага маўлення функцыянуе як кампанент тэксту. У маўленні адзін і той жа сказ можа мець розны сэнс. Параўнайце: *Ганна прачнулася ад холаду* (З якой прычыны?); *Прачнулася ад холаду Ганна* (Хто?); *Ад холаду Ганна прачнулася* (Што адбылося з Ганнай?); сказ з аднолькавым граматычным саставам можа служыць асновай для перадачы некалькіх паведамленняў.

Сказ, які функцыянуе ў якасці адзінкі паведамлення, называецца **выказваннем** (гл. **ВЫКАЗВАННЕ**). Сінтаксічную тэорыю, у межах якой вывучаецца сказ як выказванне, прынята называць **камунікатыўным сінтаксісам**.

**Актуальнае чляненне** – гэта сэнсавы падзел выказвання на тэму і рэму, істотны для дадзенага кантэксту ці сітуацыі. Актуальнае чляненне сказа адпавядае камунікатыўнаму заданню, г.зн. арганізуе сказ для перадачы актуальнай інфармацыі. Стваральнікам вучэння і аўтарам тэрміна "актуальнае чляненне" з'яўляецца чэшскі вучоны В. Матэзіус (1920 – 1930-я гг.). У беларускім мовазнаўстве спецыяльных тэарэтычных прац, прысвечаных актуальнаму чляненню, няма. Але існуе шэраг публікацый (А.А. Антанюк, Т.П. Бандарэнка, Л.Ц. Выгонная, А.Я. Міхневіч і інш.), у якіх так ці інакш закранаецца праблема актуальнага чляненне.

**Актуальная інфармацыя** – інфармацыя, якая з'яўляецца істотнай, важнай для пэўнага кантэксту або сітуацыі. Актуальнае чляненне звязана з сінтаксічным, аднак не падпарадкоўваецца яму, таму што актуальнае чляненне заўсёды бінарнае (уключае тэму і рэму), тэмай і рэмай могуць быць любыя члены сказа (як галоўныя, так і даданыя).

**Тэма** – зыходны пункт выказвання, актуальна менш значны, чым рэма, звычайна вядомы, прадвызначаны папярэднім кантэкстам (або ўяўляецца, разумеецца як вядомы): *Звычайна кожны дождж / пахне па-свойму* (Я.Сіпакоў*); У кожнага аўтара / свая дарога і свой лёс* (А.Бачыла). Функцыі тэмы характэрны, як правіла, для слоў з прадметным значэннем (як у назоўным, так і ва ўскосных склонах).

Выказванне можа мець нулявую тэму, г.зн. граматычна не выражаную: *Зіма. Белыя дрэвы. Белыя стрэхі хат* (Б. Сачанка); *Пачынала світаць* (У. Дамашэвіч). Такія выказванні проста канстатуюць наяўнасць падзей і фактаў (гэта звычайна намінатыўныя, безасабовыя, двухсастаўныя сказы з пераходным дзеясловам у функцыі выказніка).

**Рэма** – ядро выказвання, актуальна больш значнае, чым тэма, змяшчае ў сабе асноўны змест паведамлення: ...*Шчасце / − нідзе не спыняцца ў дарозе, Спынішся / − плынню адгоніць назад* (С. Грахоўскі); *Многа радасці / можна зазнаць у зімнім лесе* (У. Краўчанка); *Дарагія ўспаміны пра хараство чалавечай душы / пакінула ў мяне вучоба ў школе* (К. Кірэенка).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ